представлен в ряде драматических и музыкальных спектаклей как олицетворение угрожающего персонажа, живущего параллельно с миром людей, так и дружелюбного дракона, несущего пользу человеку. Образ дракона воплощается посредством актерского мастерства (С. Лагутенко) и средств выразительности сценографии (театральная кукла, бутафория).


*1.* Гомельский областной драматический театр [Электронный ресурс] / Гомель. обл. драм. театр : официальный сайт. – Режим доступа: https://www.gomeldrama.by/?page_id=10598/. – Дата доступа: 13.02.2022.

*2. Мальчевская, Е.* Время драконов [Электронный ресурс] / Е. Мальчевская. – Режим доступа: https://www.screenstage.ru/?p=1267. – Дата доступа: 27.02.2022.

*3.* Международный фестиваль мифологии «В гости к Лепельскому Цмоку» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.anydaylife.com/festival/3112/v-gosti-k-lepelskomu-tsmoku. – Дата доступа: 27.02.2022.


УДК 7.036.7:75Рущиц


***А. В. Пагоцкая,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дэкан факультэта мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


# ТВОРЧАСЦЬ ФЕРДЫНАНДА РУШЧЫЦА Ў КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦТВА СІМВАЛІЗМУ


**Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца асаблівасці жывапісу Ф. Рушчыца, беларускага мастака, графіка, карыкатурыста, пейзажыста, тэатральнага дэкаратара і педагога, чыя праца прыйшлася на мяжу стагоддзяў, калі ў еўрапейскім мастацтве існавалі розныя напрамкі і мастацкія школы: ад рэалізму да мадэрнізму. Творчая спадчына мастака прыцягвае ўвагу высокім прафесіяналізмам, шматграннасцю таленту, драматызмам, дзіўнай экспрэсіяй. Зроблена спроба прааналізаваць выразныя сродкі, стылістыку, тэматыку ў творчасці мастака ў кантэксце выяўленчага мастацтва пачатку XX ст.



**Ключавыя словы**: акадэмізм, выяўленчае мастацтва, графіка, жывапіс, каларыт, пейзаж, сімвалізм.



***E. Pahotskaya,***
*Candidate of Art History, Dean of the Faculty of Art Culture of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

# CREATIVITY OF FERDINAND RUSCHITS IN THE CONTEXT OF THE ART OF SYMBOLISM

**Abstract**. The article discusses the features of F. Ruschits painting. He was a Belarusian artist, graphic artist, cartoonist, landscape painter, theater decorator and teacher. His work fell at the turn of the century, when various trends and art schools existed in European art: from realism to modernism. The artist's creative heritage attracts attention with high professionalism, versatility of talent, drama, amazing expression. An attempt is made to analyze the expressive means, stylistics, themes in the artist's work in the context of fine art of the early of the twentieth century.

**Keywords**: academism, art, graphics, painting, color, landscape, symbolism.

Фердынанда Рушчыцааднолькава лічаць сваім беларусы, палякі, і літоўцы. Ён быў адным з тых дзеячаў, якія заклалі асновы беларускага пейзажнага жывапісу, Рушчыц стаяў ля вытокаў развіцця нацыянальнага духоўнага адраджэння пачатку XX ст. і пакінуў значную творчую спадчыну ў выяўленчым мастацтве.

Фердынанд Рушчыц – яркі прадстаўнік сімвалізму ў мастацтве, які злучыў традыцыі нацыянальнага жывапісу і заходнееўрапейскія тэндэнцыі, стварыў рэгіянальнае (віленскае, або заходнебеларускае) мастацтва першай чвэрці XX ст. [2].

Памяць пра знакамітага мастака захоўваюць у многіх краінах, з якімі звязаны яго жыццё і творчасць. У Мінску ў яго гонар названа вуліца і ўстаноўлена мемарыяльная дошка, у Польшчы і Літве імя Фердынанда Рушчыца прысвоена мясцінам, дзе ён жыў і працаваў. На малой радзіме мастака, у Багданаве, яго імем названа вуліца, штогод праводзіцца Міжнародны дзіцячы пленэр «Зямля і неба Фердынанда». Адраджэнне фамільнай сядзібы ў Багданаве спрыяе сустрэчы мастакоў і аматараў яго творчасці з розных краін свету.

Творчасць майстра мае вялікае значэнне для культуры сучасных Беларусі, Літвы і Польшчы. Большасць работ Фердынанда Рушчыца апынулася за межамі Беларусі, яго карціны захоўваюцца ў музеях Варшавы, Кракава, Вільні і Львова, еўрапейскіх і амерыканскіх прыватных калекцыях.

Прыгажосць навакольнай прыроды і выхаванне на хрысціянскіх каштоўнасцях, безумоўна, паўплывалі на фарміраванне будучага мастака. Фердынанд наведваў прыватную школу

мастака Казьмы Ермакова, выхаванца Пецярбургскай Імператарскай Акадэміі мастацтваў, браў урокі малюнка, значна пазней з павагай і ўдзячнасцю ўспамінаў свайго першага настаўніка. У 1891 г. Рушчыц быў залічаны ў Акадэмію мастацтваў на аддзяленне жывапісу і вырашыў канчаткова звязаць сваё жыццё з мастацтвам. Спачатку быў вучнем у майстэрні вядомага мастака, прафесара І. Шышкіна, у 1895–1897 гг. працягваў навучанне ў пейзажыста А. Куінджы.

Вучоба ў Шышкіна і Куінджы аказала моцны ўплыў на будучага мастака, дазволіла асвоіць галоўныя метады працы не толькі ў акадэмічных майстэрнях, але і на пленэры. «У Шышкіна мы вучыліся малюнку, тэхніцы, так бы мовіць, арыфметыцы, зараз павінны перайсці да абагульненняў – алгебры, кампазіцыі» [3, с. 8]. Па парадзе Шышкіна ў 1894–1895 гг. Рушчыц выязджаў у Крым, дзе зрабіў шэраг жывапісных накідаў і замалёвак алоўкам: «Крымскі матыў – Алупка» (1894 г.), «Скалы над морам» (1895 г.), «Скалісты бераг і хваля» (1895 г.), «Мора і скалы» (1895 г.) і інш. Потым накіраваўся ў першае замежнае падарожжа праз Шчэцін і востраў Руген у Паўднёвую Швецыю і Берлін, адкуль прывёз жывапісныя эцюды ў больш халодным каларыце «Дзве лодкі з ветразямі» (1896 г.), «Марскі бераг» (1896 г.) і інш. Педагогі добра ставіліся да яго першых крокаў у мастацтве, і гэта давала стымул да далейшай творчасці і пошуку сваёй асаблівай жывапіснай манеры [3].

У Акадэміі ўтварылася група вучняў А. Куінджы, у якую ўвайшлі А. Рылаў, М. Рэрых, К. Багаеўскі, латыш В. Пурвіт, паляк К. Урублеўскі. Маладыя мастакі хоць і былі прыхільнікамі рэалістычнага жывапісу, але імкнуліся праявіць сябе і ў новых напрамках, узбагачаных школай імпрэсіянізму. Кожны з іх з цягам часу стане вядомым і паўплывае на фарміраванне нацыянальнай школы пейзажнага жывапісу.

Фердынанд паспяхова пераняў усё лепшае з традыцый рускіх, польскіх, французскіх майстроў, не кажучы ўжо пра беларускую народную традыцыю. Высока цаніў яго каларыстычныя і жывапісныя поспехі І. Рэпін, бо заўважыў у маладога мастака выбітны талент. Рушчыц па-майстэрску валодаў пэндзлем і быў здольны перадаць у карцінах рамантычную і лірычную адухоўленасць («Балада», «Ля касцёла», «Стары дом», «Крэва»), і драматычна шчымлівую ноту («Зямля», «Эмігран-

ты», «У свет» і інш.). Усе яго знакамітыя карціны былі напісаны прыкладна за дзесяцігоддзе з 1898 па 1908 гг.

Вытокамі таленту і натхнення мастака заўсёды былі родныя мясціны. Падчас вучобы ў Акадэміі ён прыязджаў у Багданава і Вішнева кожны год на эцюды. Пад уражаннем ад родных пейзажаў ён у 1898 г. паведамляў: «Мы бачым прыгажосць іншых краін, захапляемся імі... але любім толькі сваю, адчуваем, што яна належыць нам, а мы ёй» [3, с. 11]. Тут Ф. Рушчыц напісаў адно з вядомых палотнаў – «Зямля» (1898 г.) – просты сялянскі матыў, даведзены да манументальнасці і эмацыянальнай напружанасці. Мастацкі крытык Э. Невядомскі, вучань І. Рэпіна, адзначыў: «Са звычайнага ворыва Рушчыц зрабіў сімвалічную драму» [3].

Рушчыца цікавіў пейзаж, але пейзаж сімвалічны; амаль заўсёды бязлюдны, аднак поўны намёкаў на ўнутраны свет назіральніка. Людзі, калі і прысутнічаюць на карцінах, не трапляюць у цэнтр увагі, яны размытыя і падкрэслена безаблічныя – араты, пілігрым, выпадковы падарожнік. Нават у зусім бязлюдным пейзажы адчуваецца напоўнены і асэнсаваны погляд у вечнасць. Паступова мастак выпрацаваў асаблівы творчы стыль, трывожны, стрымана-ўрачысты, «музычны». «Зямля» выразна пераклікаецца з «Падзеннем Ікара» П. Брэйгеля, бо ў цэнтры ўвагі таксама запрэжка аратага. Рушчыц, схільны да мінімалізму, прыбраў з карціны ўсе неістотныя дэталі. «Зямля» не мае нічога агульнага з гэтай улагоджанай карцінай збору ўраджаю. Пара велічэзных, панурых, чорных валоў, якія меланхалічна цягнуць за сабой плуг, павольна прабіраецца па пагорку. Хмурнае, няветлівае неба з трывожна клубнымі аблокамі навісла над схілам, каб зрабіць працу аратага яшчэ цяжэй, амаль невыноснай. Сагнуўся чалавек над плугам, як быццам дэманстратыўна адвярнуўшыся ад неба. Неба і зямля ў адвечным канфлікце. Чорная дуга – гэта шар самой Зямлі, маленькай планеты.

Вясной 1899 г. «Зямля» ўпершыню была выстаўлена ў Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу, а зімой у Варшаве яе купіла галерэя «Захэнта». Слава карціны і імя яе аўтара Ф. Рушчыца, літвіна з Ашмяншчыны, разнесліся дзякуючы польскамоўнай прэсе: трыццацігадовы мастак стаў знакамітым.

На мяжы XIX–XX стст. на эстэтыку пейзажнага жанра паўплываў мастак Фердынанд Ходлер – швейцарскі пейзажыст і майстар сімволіка-міфалагічнай кампазіцыі. Ён ствараў свайго роду сімфоніі, падпарадкоўваючы малюнак музычнаму рытму, які складаецца з паралельных ліній. Прыёмы Ходлера (перш за ўсё кампазіцыйныя) настолькі поўна і ўсебакова асвоены жывапісцамі многіх краін, у тым ліку Польшчы, што без яго гісторыя еўрапейскага пейзажу мяжы стагоддзяў была б няпоўнай. Прыхільнасць мастака і яго паслядоўнікаў да паралельных ліній выклікала да жыцця напрамак, які атрымаў назву паралелізм. У гэтым стылі афармленыя многія плакаты і кніжныя вокладкі XX ст., якія маюць у аснове, напрыклад, жанр горнага пейзажу.

У 1900 г. ва ўласным садзе Ф. Рушчыц напісаў карціну «Старыя яблыні». Здаецца, што менавіта пад уплывам ходлераўскай эстэтыкі мастак паказаў вывернутыя ствалы. Пераплеценыя галіны нібы нагадваюць старэчыя рукі знясіленых людзей, якія выпрабавалі гады цяжкай працы і страцілі магчымасць працаваць.

Мастак збіраўся намаляваць адну і тую ж групу старых яблынь у розныя поры года пры розным асвятленні – своеасаблівы трыпціх, аналага якому гісторыя мастацтваў яшчэ не ведала. Квітнеючыя яблыні на фоне вясновага заходу; яблыні, пакрытыя цёмна-зялёнай лістотай, абсыпаныя спелымі пладамі, у пахмурны ліпеньскі дзень; і, нарэшце, голыя яблыні на снезе, на фоне яркага сонечнага святла. Годам пазней Рушчыц пісаў у сваім дзённіку: «З часу маёй “Зямлі” не адзін матыў так мяне не праследаваў, як гэтыя яблыні. Паўсюль яны мне мрояцца, усё прымае выгляд яблыкаў, нават літары, калі спрабую чытаць. Усюды гэтыя буйныя, спелыя, сакавітыя плады, падобныя на грудзі маладой жанчыны» [3].

Эцюды і эскізы вынікалі адзін за адным, ідэі ўспыхвалі і з расчараваннем адхіляліся, але па-сапраўднаму праца прасоўвалася толькі з адной з карцін задуманага шэдэўра. У кастрычніку 1900 г. Рушчыц яе скончыў, назаўжды развітаўшыся з першапачатковай задумай трыпціха. Але «Старыя яблыні» сапраўды ўдаліся – поўныя трывогі, прадчування катастрофы, якая павольна набліжаецца. Іранічная ўсмешка над некалі юнымі прыгажунямі яблынямі, ці хутчэй пяшчота і спачуванне

да лёсу няшчасных дрэў, змярцвелых ад жаху, якія чакаюць бязлітаснай сякеры і вогнішча на сметніку.

У сакавіку 1911 г. у Мінску адбылася буйная мастацкая выстава, у якой удзельнічалі 47 мастакоў і 166 твораў мастацтва, уключаючы плакаты, архітэктурныя праекты і ювелірныя вырабы. Куратарам выставы быў скульптар Я. Цішынскі – настаўнік малявання ў сем'ях Ваньковічаў, Прушынскіх і Чапскіх. Рэпартаж (у тым ліку і фота) для сакавіцкага нумара часопіса «Tygodnik Wileński» рабіў бацька беларускай і польскай фатаграфіі Ян Булгак, які адзначыў, што «Мінск здолеў самастойна арганізаваць добрую мастацкую выставу – лаканічную, вытрыманую ў добрым шляхетным стылі» [1, с. 151].

Асноўным акцэнтам экспазіцыі стаў адзін з экспрэсіўных твораў Фердынанда Рушчыца «Nec Mergitur» – містычная, выразная,неверагодных колераў хваля, на якой узвышаецца яскравы, асветлены барвовым заходам карабель. Цяпер гэты твор экспануе Нацыянальны мастацкі музей Літвы.

Мастак пачаў ствараць у лютым 1904 г. адну з незвычайных карцін «Nec Mergitur» («Не патапляльны», 1905 г.). Канчатковы варыянт кампазіцыі адлюстроўвае парусьнік, які плыве па бурнаму мору і прадстаўлены з боку кармы. За ім цягнецца паласа белай пены. У карабля чырвоныя ветразі, ён свеціцца, кідае на ваду чырвоныя блікі. Над ім зорнае неба, якое адлюстроўваецца ў вадзе каштоўнымі камянямі. Корпус карабля абезгалоўлены, арганічны па сваіх формах і бліжэй да прывіднага карабля з марскіх легенд, чым да рэальнага. Сваю карціну Рушчыц хацеў «захаваць нерэальным, як каскад брыльянтаў» [3].

Ф. Рушчыц насыціў малюнак прыроды новымі шматлікімі сэнсамі. Ён быў бы выдатным майстрам класічнага пейзажу, але найноўшыя тэндэнцыі ўладна заяўлялі аб сабе, і мастак унёс велізарны ўклад у станаўленне жанру сімвалісцкага пейзажу і пейзажу-настрою.

Творчая спадчына мастака прыцягвае ўвагу высокім прафесіяналізмам і шматграннасцю таленту. Для Беларусі важна, што ў яе сумеснай з іншымі краінамі гісторыі ёсць такія выбітныя асобы, культурная спадчына якіх выступае як мова міжнацыянальных зносін, спрыяе ўмацаванню і развіццю сяброўскіх адносін.

1. *Грамыка, М.* Беларускі пейзажны жывапіс першай паловы XX стагоддзя / М. Грамыка. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 168 с.
2. *Прокопцов, В. И.* Небо и земля Фердинанда Рущица [Электронный ресурс] / В. И. Прокопцов // Третьяковская галерея. – 2018. – № 3 (60). – Режим доступа: https://www.tg-m.ru/articles/3-2018-60/nebo-i-zemlya-ferdinanda-rushchitsa. – Дата доступа: 12.01.2022.
3. *Рушчыц, Ф.* Дзённік. Да Вільні. 1894–1904 / Ф. Рушчыц / уклад., апрац. тэксту, прадм. і камент. Э. Рушчыца. – Мінск : Медысонт, 2002. – 227 с.

УДК 133.521.2+006.95

***Пан Бо,***
*соискатель ученой степени кандидата искусствоведения*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# ВОСТОЧНОЕ И ЗАПАДНОЕ ЗОДИАКАЛЬНОЕ ИСКУССТВО

**Аннотация**. С развитием религии и астрологии как на Востоке, так и на Западе появились символы и произведения искусства, представляющие изображение зодиака.

В статье рассматривается история зодиака на Востоке и Западе, сочетающая знаки животных, религиозные и другие художественные образы, производные от зодиака, анализируется художественная ценность произведений.

**Ключевые слова**: зодиак, искусство, знак, календарь.

***Pang Bo,***
*Applicant for the degree of Candidate of Art History of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

# EASTERN AND WESTERN ZODIAC ART

**Abstract**. With the development of religion and astrology in the East and the West, symbols and works of art representing the different times of the zodiac emerged. This article will discuss the history of the zodiac in the East and the West, combine the animals, religions, and other artistic patterns derived from the zodiac to conduct research, and analyze the artistic value of these works.

**Keywords**: zodiac, art, sign, calendar.